# ИСТОРИЯ

**Вуглік Ігар Рыгоравіч**
Кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава
Uglikigor@gmail.com

## ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ ЯК ГРАМАДСКАЯ СІСТЭМА

В статье рассматривается системно-структурная организация общества Великого Княжества Литовского. В основе теоретического подхода лежит принцип бинарных оппозиций с медиатором между ними, который дезавуирует деструктивную борьбу дихотомий. Изучаются социальная, политическая, экономическая, религиозная, художественная системы Княжества. Делается вывод об открытом, горизонтальном характере системной общественный организации, основанной на гибком соотношении бинарных оппозиций и медиатора, что обеспечивало позитивный характер реализации личностных, общественных интенций.

Ключевые слова: *культура этноса; белорусская культура, бинарные оппозиции, медиатор, историко-культурный стиль.*

Сярод тэарэтычных падыходаў да вывучэння гісторыка-культурных працэсаў адным з плённых з'яўляецца сістэмны, структурны, які грунтуецца на падыходзе да аб'екта даследавання як згуртаванага ўнутранымі сувязямі кансорцыума, што існуе ў пэўным сінхронным вымярэнні. Сістэмная арганізацыя – істотны кампанент усялякага сацыяльна-культурнага ўтварэння, больш таго, структура (кампанентны каркас сістэмнага высокатаксанамічнага ўтварэння) – фундаментальная характарыстыка культуры, таго, што бароніць ад небяспечных энтрапійных (дэструкцыйна-хаатычных) працэсаў. У дадзеным выпадку пад сістэмай будзе разумецца кампактна арганізаванае семантычна злучанае сацыяльна-культурнае ўтварэнне, а пад структурай – яго кампазітны каркас. У даследаванні будзе выкарыстоўвацца апрабіраваны ў культурнай антрапалогіі сістэмна-структурны метад К. Леві-Строса, заснаваны на бінарных апазіцыях і медыятарах, якія амартызуюць супрацьстаянне апазіцый, не дазваляюць перамагчы адной з іх, што можа прывесці да заняпаду сістэмы [1]. Сістэмна-структурны падыход да вывучэння культуры часоў Вялікага Княства Літоўскага выкарыстоўваўся ў даследаваннях аўтара дадзенай работы [2; 3].

Вялікае Княства Літоўскае – арганічны сацыяльна-культурны феномен, які меў збалансаваную, з бінарнымі апазіцыямі і медыятарамі, сістэму жыццядзейнасці, канчаткова ўсталяваную ў XVI ст. і тыпалагічна належаўшаю да цывілізацыі пераважна заходняга тыпу [3]. У культурнай гісторыі краіны вялікая роля адводзілася апазіцыям усход / захад і традыцыя / навацыя, супрацьстаянне якіх мікшыравалася праз наяўнасць разнастайных

медыятараў [2, с. 50–52]. У сацыяльным плане грамадская сістэма трымалася на гнуткіх узаемаадносінах элементах складанай сацыяльнай структуры феадальнага грамадства. Фармальна класу дваран (шляхты, магнатэрыі) бінарна апазіцыяніравала сялянства, медыятарам быў горад і часткова мястэчка. Насамрэч пануючым слаям – шляхце і каталіцкаму духавенству, – бінарна супрацьстаялі гараджане і праваслаўны, пратэстанцкі, часткова ўніяцкі клір. Гістарычна беларускае сялянства не адыгрывала, у адрозненні ад шэрагу развітых еўрапейскіх краін, значнай ролі ў палітычных, канфесійных канфліктах і, дзякуючы сваёй пасіўнасці, аб'ектыўна выконвала ролю медыятыўнага стрымальніка апазіцыйнага напружання.

Бінарная структура прадугледжвае наяўнасць раўнаважных апазіцыйных утварэнняў, і тут у культуры Княства паступова пашыраўся дысбаланс, які прывёў у выніку да трагічнага, дэструкцыйнага заняпаду сістэмы. Гаворка ідзе аб дыхатаміі шляхты і гараджан і паступовай перавазе першай, што ішло насуперак кардынальнаму шляху развіцця тагачаснага еўрапейскага грамадства да буржуазнага ладу. У сярэдзіне XVII ст. ў гарадах Княства жыло каля 370 000 чалавек, 8,2 % насельніцтва; у другой палове XVIII ст. на беларускіх землях Княства ў 39 гарадах і каля 360 мястэчках жыло каля 250 000 чалавек, каля 11 % жыхароў [4. с. 545]. Як бачна, колькасць гарадскога насельніцтва значна скарацілася; акрамя гэтага, мяшчане доўгі час былі пазбаўлены праў зямельнай уласнасці – толькі ў 1775 г. закон сейма дазволіў мяшчанам валодаць населенымі землямі з правамі спадчыннасці.

Заняпад беларускіх гарадоў пасля Паўночнай вайны, ранейшых узброеных канфліктаў, заканадаўчае стрымліванне шляхецкім урадам буржуазных рэформ выклікалі замаруджванне развіцця "трэцяга саслоўя", рынкавых капіталістычных адносін, стварэння моцнай буржуазна-дэмакратычнай апазіцыі шляхце і феадальным парадкам. Слабы ўзровень "капіталізацыі" магнатаў, шляхты, іх марудны пераход да капіталістычных форм вытворчасці, слабое выкарыстанне грашовых, іншых матэрыяльных сродкаў для стварэння буржуазнай прамысловасці, банкаў, бірж, як гэта было ў Еўропе, абумовіў дамінаванне ў грамадстве адной часткі апазіцыі – шляхецкай, што выклікала заняпад сістэмы.

Палітычная сістэма Вялікага Княства Літоўскага вылучалася гнуткім балансам супрацьваг, дзе ўлада Вялікага князя (караля) была заканадаўча абмежаваная, а дзейнасць паноў-рады кантралявалася Соймам. У бінарным вымярэнні паміж грамадствам і выканаўчай уладай (Вялікі князь, паны-рада) стаяў заканадаўчы орган – Сойм, дзе залогам плюралізму была свабодная дзейнасць фракцыйных групіровак, абвяшчэнне канфедэрацый.

У адрозненне ад іншых еўрапейскіх краін, дзе палітычны ўплыў дваранства быў абмежаваны абсалютызмам каралеўскай улады (Францыя, Іспанія, Прусія, іншыя), парламентам (Англія, Галандыя (Нілэрланды), сеньярыямі

(італьянскія рэспублікі – Венецыянская, Генуэзская, Фларэнтыйская, іншыя), у Рэчы Паспалітай і Княстве не існавала моцнай палітычнай супрацьвагі магнацка-шляхецкаму панаванню. Бінарнасць закона, парадка – і палітычных свабод, якія медыятыўна павінны было падтрымліваць заканадаўства, атрымалі істотны хіл у бок шляхецкіх свабод, што выклікала лагічную дэструкцыю грамадска-палітычнага жыцця, дзяржаўнай сістэмы.

Істотным медыятарам паміж самаўладствам і ўладай закона былі Статут, разгалінаваная судовая сістэма і адпаведнае заканадаўства. Пры ўсіх хібах судовай сістэмы – значнай колькасці відаў судоў, адсутнасці належнай уніфікацыі, дастаткова вялікіх грошах, які патрабаваў ад удзельнікаў судовы працэс, – суд забяспечваў прававую трываласць грамадства. Судовыя дакументы ўтрымліваюць вялікую колькасць матэрыялаў аб самых розных па цяжкасці ўчынкаў – ад крадзежу шапцы ў карчме – да забойстваў падчас “наездаў”, што сведчыць ад існаванні асноў прававога грамадства.

Структурная бінарнасць эканамічнай сістэмы грунтавалася на раўнавазе прыватнай і дзяржаўнай уласнасці на зямлю; медыятыўную ролю адыгрывалі разнастайныя віды “трыманняў” дзяржаўнай, прыватнай зямлі і маёмасці. Прыватнымі былі зямля, населеныя пункты, сродкі вытворчасці, прычым, прыватная ўласнасць валодала істотнай вагай, што характэрна для еўрапейскай цывілізацыйнай супольнасці. Так, згодна з дадзенымі 1790 г., на беларускіх землях пераважала прыватная ўласнасць на сялянскія гаспадаркі – 65 % (269 972 дыма), дзяржаве належала 24,6 % , царкве – 10,4 %, прычым, на заходніх землях прыватная ўласнасць значна пераважала [5, с. 65–66]. Прыватная ўласнасць распаўсюджвалася і на гарады, мястэчкі. У другой палове XVII–XVIII ст. на беларускіх землях быў 51 горад, з іх 25 – прыватнаўласніцкія, у 70-х–90-х гг. XVIII в. – 39 гарадоў, з іх 12 – прыватных [6, с. 39–38].

Эканамічная мадэль грамадства была рынкавай, адчыненай, у Беларусь везліся тавары еўрапейскіх краін, Расіі (Масковіі), сярэдняга, далёкага Ўсходу. У сваю чаргу, беларускія тавары таксама мелі шырокі рынкавы спрос. Так, знешнегандлёвыя сувязі феадальных гаспадарак Усходняй Беларусі актыўна развіваліся ў чатырох накірунках: Расія, Украіна, партовыя гарады Польшчы (Гданьск, Вроцлаў, Крулявец), і таксама Рыга [7, с. 190–216].

Палітыка-эконамічную мадэль Вялікага Княства Літоўскага можна назваць гарызантальнай, бо яна, у адрозненні ад горызантальнай абсалюцістскай, заснавана на сістэмным узаемадзеянні гарызантальных элементаў – цэнтраў палітычных, сацыяльных, эканамічных уплываў, якімі на беларускіх землях былі ўладанні магнатаў. Гэта тычылася і гарадоў з іх рознай формай уласнасці і мазаічнай культурай, дзе самы выбітнай, еўрапейскі горад – сталічная Вільня – не адыгрываў вызначальную ролю ў лёсе краіны, як гэта было ў Францыі – з Парыжам, у Англіі – з Лонданам, Італіі – з Рымам (у меншай ступені),

Аўстрыі – з Венай. Княства было пазбаўлена істотнай для шэрагу еўрапейскіх краін фатальнай для дзяржавы ролі лёсу сталіцы. Так, нават заняцце войскамі Івана IV сталіцы Вільні не выклікала дзяржаўнай катастрофы.

Рэлігійная сітуацыя таксама адрознівалася сістэмнай ўстойлівасцю. Раўнавага канфесійнай сітуацыі грунтавалася на наяўнасці медыятыўных канфесій паміж каталіцызмам і праваслаўем. Спачатку гэта была рэфармацыя (пратэстантызм), якая, па сутнасці, заклала асновы істотнай рысы грамадскай свядомасці, этнапсіхалогіі беларусаў – талерантнасці. Падаецца, што гэтая ментальная асаблівасць усталявалася менавіта ў XVI ст. (хаця яе вытокі – у паважлівых адносінах да праваслаўных вернікаў Вялікіх князёў) пад уплывам лаяльных паводзін рэфарматараў і адпаведных адносін да іх з боку прадстаўнікоў іншых канфесій. Рэлігійныя войны, якія суправаджалі пашырэння рэфарматарства ў Еўропе (Германія, Чэхія, Францыя, жорсткія канфлікты ў Англіі) абмінулі Беларусь. Землі Вялікага Княства Літоўскага зрабіліся ў Рэчы Паспалітай не толькі ідэйным, але і міграцыйным цэнтрам новай канфесіі для шляхты [8, с. 131]. Канфесійнае становішча ў краіне з XVI ст. традыцыйна было полем гарачых дыскусій, у другой палове XVII–XVIII ст. яны набылі найбольш агрэсіўны характар у кантэксце праблемы: адна дзяржава (Рэч Паспалітая) – адна вера (каталіцызм). У гэты час медыятыўную ролю (паміж каталікамі з аднаго боку і праваслаўнымі і пратэстантамі – з другога) адыгрывала ўніяцтва, якое вызнавала абсалютная большасць беларускіх сялян, частка гараджан. Нязначныя па памерах канфлікты на рэлігійнай глебе адбываліся ў гарадах у асноўным паміж пратэстантамі і каталікамі, у сельскай мясцовасці буйных сутычак на канфесійнай аснове амаль не было. Дысбаланс у рэлігійную сітуацыю ўносілі знешнія ўплывы – казацкія, маскоўскія ўзброеныя напады, а таксама пракаталіцкая палітыка Кароны.

Культура беларускіх зямель часоў Княства была аб'яднана стылістыкай візантыйскай культуры, раманскага ўплыву, готыкі, рэнесанса, метакультурнага барока, затым ракако, класіцызма. Інтэлектуальная думка стойка ўтрымлівала асновы рэнесанснага свабодамыслення. З XV ст. у мастацтве пачала пераважаць еўрапейская стылістыка, аднак яна ўтрымлівала сувязі з бінарным усходнім мастацтвам, у першаю чаргу, у галіне рэлігійнай культуры. Гэтае ўзаемадзеянне стварыла медыятыўныя элементы, самымі знакавымі, гістарычна каштоўнымі з якіх былі: існаванне беларускай іканапіснай школы, барочнага партрэта ў характэрных варыяцыях (элементы іканапіснасці, гародзенская, мінская школы), драўлянай сакральнай разьбы, мадыфікаванага праваслаўнага дойлідства, арыгінальнага якаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Існуе пэўная сувязь паміж стракатай феадальнай структурай грамадства Княства і стылістыкай барока [9, с. 24–38]. Культура барока, культуралагічным сімвалам якой з'яўляецца фуга (паліфанія, як сродак арганізацыі музыкі

і культуры) (О. Шпенглер), уяўляе сабой сінтэз мастацтваў, наяўнасць высокага і нізкага ў стылістыцы, прадугледжвае адначасовае існаванне некалькіх мастацкіх тэм, што адпавядала агульнай сістэматыцы культуры краіны. Барочнае суіснаванне адначасова некалькіх "матываў", кампазітаў, дыхатамічныя рацыяналізм і ірацыянальнасць, імкненне да сакральнага вышэйшага і дробязная пачуццёвасць, захапленне асалодай жыцця, тэатральнасць існавання і яго сапраўдны трагізм як асэнсаванне непазбежнага скону, рэлігійны містыцызм і дэкартаўскі рацыяналізм – усё гэта аб'ядноўвалася ў постаці тагачаснага чалавека, яго асобе. Двaісты характар мела і культура часоў Асветніцтва, ракако і класіцызма – яна злучала пастулаты розуму, адукацыі з заклікамі распаўсюджанай тагачаснай ідэалагемы Ж. Ж. Русо вяртання да прыроды, а таксама рафінаванай пачуццёвасцю стыля ракако.

У цэлым Вялікае Княства Літоўскае ўяўляла згуртаваны грамадскі кансорцыум са сваёй выразнай тыпалагічная стылістыкай, – гэта было адчыненае, гарызантальнае грамадства з структурнай сістэмай бінарных супрацьвагаў і медыятарамі. Вялікае Княства Літоўскае ўтварыла кампазітны сінтэз гнуткіх у гарызантальным і вертыкальным вымярэннях сістэм, іх структурная арганізацыя прадугледжвала забеспячэнне існавання арганізма, нават, у выніку адказу функцыянавання некалькіх блокаў. Пры калапсе заканадаўчай улады – Сойма ў выніку злоўжывання правілам "Liberum veto", – працягвалі дзейнічаць ваеводскія, павятовыя, судовыя ўстановы; праблемы гарадоў і адміністрацыйных адзінак дзяржаўнай маёмасці не перашкаджалі развіццю прыватнаўласніцкім уладанням, эканамічнаму ўздыму прыватных гарадоў, мануфактур гэтага ж перыяду (Слуцк, Налібокі, Урэчча).

Аб адчыненым характары беларускага грамадства сведчыла геапалітычная, культурная арыентацыя краіны, якая была шматвектарнай: захад (Польшча, Францыя, Італія, Германія, Галандыя), усход (Персія), поўдзень (Турцыя, балканскія славянскія культуры,) поўнач (Расія, Швецыя) [10].

Грамадская сістэма, культура Княства без пагрозы ўласнай дэструкцыі былі адчынены для імпарту ідэй, матэрыяльных тавараў і актыўна экспартавалі іх. На беларускіх землях былі ўспрыняты, адаптаваны стылёвыя ідэйнамастацкія канцэпты ад рэнесанса да Асветніцтва, што сведчыць аб плённасці мясцовай культурнай глебы. Тут жылі і працавалі ў XVII–XVIII ст. каля 500 (па розных падліках) выбітных дзеячаў еўрапейскай навукі (філасофіі, астраноміі, батанікі, іншых), архітэктары, скульптуры, выяўленчага мастацтва, музыкі, балета, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прамысловых тэхналогій. Мясцовая моладзь атрымлівала адукацыю ў еўрапейскіх універсітэтах (Кракаўскім, Пражскім, а таксама італьянскіх, французскіх, нямецкіх, англійскіх, галандскіх), каб потым выкарыстоўваць атрыманыя веды на радзіме (паказальна, што выпадкаў эміграцыі было няшмат, і яны тычыліся ў асноўным шлюбаў).

Адчынены тып грамадства – досыць якасны і складаны палітычны, эканамічны, культурны арганізм. Яго існаванне прадугледжвае наяўнасць моцнага аўтэнтычнага патэнцыялу, які дазволіць захаваць дзяржаўную, культурную, грамадскую сістэму, супольнасць. Перавага адкрытай сістэмы – у яе падпітцы новымі рэаліямі іншых этнасаў і культур, узбагачэнні навацыямі, якія робяць існаванне сістэмы насычаным, плённым для этнакультурнага, палітычнага, эканамічнага развіцця. Хіл адкрытага грамадства – у магчымасці размывання структурнага каркасу навацыйнымі плынямі, страце ўстойлівых сістэмных кампанентаў сваёй аўтэнтыкі. Нягледзячы на ваенную пагрозу, знешнія небяспекі, да канца існавання Вялікае Княства Літоўскае захавала гэту адчыненасць і гэта бадай, самы станоўчы кампанент яго існавання.

Можна сказаць, што адчыненая, гарызантальная сістэмная мадэль Княства была спрыяльнай для жыцця, рэалізацыі творчага патэнцыялу асобы, што з'яўляецца асноўным крытэрыям развітога грамадства.

ЛІТАРАТУРА

1. *Леви-Стросс, К.* Структурная антропология / К. Леви-Стросс. – М. : Гл. ред. вост. лит., 1985. – 536 с.
2. *Углик, И. Г.* Цивилизационные параметры общества белорусских земель XVII–XVIII вв. / И. Г. Углик // Вести ин-та совр. знаний. – 2015. – № 4. – С. 77–81.
3. *Углик, И. Г.* Структурный подход к исследованию культуры Беларуси XVII–XVIII вв. / И. Г. Углик // Вести ин-та совр. знаний. – 2014. – № 2. – С. 49–53.
4. Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2005. – Т. 1: Абаленскі – Кадэнцыя. – 688 с.
5. *Козловский, П. Г.* Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. – Минск : Наука и техника, 1982. – 206 с.
6. *Грицкевич, А. П.* Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов) // А. П. Грицкевич. – Минск : Наука и техника, 1975. – 248 с.
7. *Мелешко, В. И.* Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии (вторая половина XVII–XVIII в.) / В. И. Мелешко. – Минск : Наука и техника, 1975. – 248 с.
8. *Tazbir, J.* Reformacja w Polsce. Szkice o ludziach i doktrjnie / J. Tazbir. – Warszawa : Książka i Wiedza. 1993. – 264 c.
9. *Лазука, Б. А.* Беларускае барока. : гісторыка-тэарэтычныя праблемы стылю / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2001. – 144 с.
10. *Углик, И. Г.* Основные направления трансляции культурной информации на землях Беларуси / И. Г. Углик // Евразия и евразийство: история, политика, социум, образование, культура : сб. науч. ст. // Материалы Евразийского науч. форума, СПб., 22–23 нояб. 2012 г. / общ. науч. ред. М. Ю. Спириной. – СПб. : МИЭП, 2012.– Ч. 1. – С. 264–275.

*Поступила в редакцию 03.04.2023*